УДК 371.32-053.5:811.161

# ТЭКСТАВАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ВУЧНЯЎ У СІСТЭМЕ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ ДА НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

*Мартынкевіч Святлана Васільеўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле раскрываюцца дыдактычныя асновы выкарыстання тэксту пры фарміраванні моўнай, маўленча-камунікатыўнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый вучняў у працэсе навучання беларускай мове. Прапануюцца метадычныя прыёмы працы з навуковым тэкстам вучэбнага дапаможніка, сістэма заданняў для засваення маўленчых паняццяў на аснове тэксту, разглядаецца методыка стварэння ўласных тэкстаў.*

***Ключавыя словы:*** *тэкст, тэкставая дзейнасць, прыметы тэксту, крытэрыі адбору тэксту, кампетэнтнасны падыход.*

***Abstract.*** *The article reveals the didactic foundations of using the text in the formation of students' linguistic, speech-communicative and linguocultural competences in the process of teaching the Belarusian language. Methodological techniques for working with the scientific text of the textbook are proposed, a system of tasks for studying speech concepts based on the text is considered, and a methodology for creating one's own texts is revealed.*

***Key words:*** *text, text activity, text features, text selection criteria, competency-based approach.*

На сучасным этапе развіцця моўнай адукацыі дэклараваныя вучэбнай праграмай лінгваметадычныя падыходы да навучання беларускай мове накіраваны на стварэнне для вучняў спецыяльных умоў, “у якіх яны прымалі б удзел у дзейнасці, а сама дзейнасць была б значымай для кожнага, адбывалася б у межах канкрэтных жыццёвых сітуацый” [4, с. 31]. Асабліва значным уяўляецца вызначаны кірунак у кантэксце сучаных патрабаванняў адукацыйнага стандарта з пазіцыі асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў навучання [1]. Моўная, маўленча-камунікатыўная і лінгвакультуралагічная кампетэнцыі, якія павінны быць сфаміраваныя ў працэсе навучання беларускай мове, накіроўваюць да вызначэння шляхоў арганізацыі вучэбнай працы, дзе тэкст знаходзіцца ў цэнтры ўвагі як узор, працэс і вынік навучання.

Мэтай артыкула з'яўляецца разгляд методыкі працы з тэкстам на дзейнаснай аснове ў сістэме кампетэнтнаснага навучання беларускай мове. Навуковы вучэбны тэкст, размешчаны ў вучэбным дапаможніку, выступае ў якасці матэрыялу, на аснове якога фарміруецца моўная кампетэнцыя вучняў. Тэкст як асноўны дыдактычны сродак служыць базай для разгляду маўленчых паняццяў і фарміравання камунікатыўнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый, з'яўляецца асновай стварэння развіццёвага асяроддзя, якая стымулюе спараджэнне выказванняў вучняў у працэсе навучання беларускай мове.

З пазіцыі лінгваметодыкі тэкст забяспечвае тэматычную цэласнасць урока, актывізуе маўленча-мысліцельную дзейнасць вучняў, стварае матывацыю, дапамагае больш дакладна вызначыць выхаваўчыя задачы навучання і міжпрадметныя сувязі.

Мэта навучання на асобным адукацыйным этапе вызначае шляхі працы з тэкстам. Пры вывучэнні новага матэрыялу тэкст з'яўляецца аб'ектам пошукава-даследчай дзейнасці. На этапе замацавання на аснове тэксту выпрацоўваюцца моўныя і маўленчыя ўменні і навыкі. Паўтарэнне і абагульненне ведаў патрабуе выкарыстання тэксту ў якасці аб'екта прымянення моўных ведаў і дэманстрацыі ўзроўню развіцця маўленчых уменняў. Кантроль і ацэнка ведаў адбываецца на аснове тэксту, якія служаць матэрыялам для дыктанту, перакладу, пераказу.

Тэксты з'яўляюцца асноўнай структурнай часткай вучэбных дапаможнікаў, яны носяць тэарэтычны (правілы) і практычны (практыкаванні) характар. Вучэбны змест, накіраваны на фарміраванне прадметных кампетэнцый, прадстаўлены тэкстамі правіл — лагічнымі азначэннямі, якія падаюць лінгвістычную інфармацыю з моўнымі ілюстрацыямі (прыкладамі) і наглядна дэманструюць узор прымянення правіла. Лінгвістычныя тэксты спрыяюць фарміраванню кагнітыўнай базы вучняў, што служыць асновай для развіцця вучэбных уменняў і дазваляе выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы. Арганізацыя самастойнай працы з вучэбным навуковым тэкстам адбываецца на аснове наступных метадычных прыёмаў:

1) складанне плана навуковага тэксту параграфа — фармулёўка пунктаў плана праз вызначэнне апорных слоў;

2) праца з ключавым лінгвістычным тэрмінам — разгляд матываванай асновы слова-тэрміна, стварэнне азначэнне паняццю;

3) выпісанне навуковых паняццяў з тэксту праграфа, іх групоўка па агульных прыметах;

4) пабудова раду навуковых тэрмінаў, вызначэнне вядомых і новых паняццяў, вызначэнне тых, пра якія трэба даведацца;

5) аналіз моўных ілюстрацый, уключаных у тэкст параграфа ў адпаведнасці з вывучаемай моўнай з'явай;

6) падбор уласных прыкладаў адносна пунктаў правіла.

Такім чынам, у працэсе сістэмнай працы з навуковым тэкстам параграфа не толькі засвойваецца

пэўная сума лінгвістычных ведаў, але разам з гэтым беларуская мова асэнсоўваецца як шматузроўневая сістэма, развіваюцца пазнавальныя магчымасці і здольнасці да самастойнай працы вучняў. Разам з тэарэтычнымі ведамі выпрацоўваюцца і практычныя ўменні — успрымаць і разумець вусныя і пісьмовыя тэксты з навуковай інфармацыяй.

Метадычны апарат практыкаванняў грунтуецца на прынцыпах кампетэнтнаснага падыходу, што арыентуюць на засваенне камунікатыўна значымых лексіка-граматычных адзінак і правіл іх функцыянавання ў маўленні. Дадатковая частка (пазатэкставы кампанент) змяшчае лінгвістычную інфармацыю, прыведзеную ў спецыяльных рубрыках. Тэкст выкарыстоўваецца як кантэкст для дэманстрацыі функцыі моўных з'яў, як матэрыял для назірання і аналізу моўных адзінак, вызначэння іх сутнасці і характэрных прымет. Да таго ж, тэкст нясе інфармацыю пра культуру народа, яго нацыянальныя асаблівасці, маральныя нормы і каштоўнасці. Ён з'яўляецца прадуктам маўленчай дзейнасці, таму ўменне ствараць тэксты ў адпаведнасці з мэтамі камунікацыі адносіцца да асноўных уменняў, якія фарміруюцца ў працэсе авалодання мовай.

З улікам адзначанага, прапануем крытэрыі адбору дыдактычных тэкстаў для арганізацыі вучэбнай дзейнасці пры засваенні праграмных лексіка-граматычных тэм:

1) інфармацыйная насычанасць, эстэтычная і выхаваўчая вартасць;

2) жанрава-стылявая і тыпалагічная разнастайнасць;

3) адаптацыя адносна ступені складанасці лексіка-граматычнай арганізацыі і ўзроставых асаблівасцей вучняў;

4) сітуацыйная аснова, якая стымулюе маўленчую дзейнасць у адпаведнасці са сферай зносін;

5) дэманстрацыя функцыянавання моўных адзінак у адпаведнасці з камунікатыўнымі якасцямі маўлення — дакладнасцю, дарэчнасцю, вобразнасцю, выразнасцю.

Тлумачэнне сутнасці моўных адзінак адбываецца праз вылучэнне ў дыдактычным тэксце апорнай лесіка-граматычнай дэталі ў адпаведнасці з лінгвістычнай тэмай. Таму назіранне і аналіз — разгляд тэксту "пад лінгвістычным мікраскопам" (М.М. Шанскі) — дапамагае ўсвядоміць функцыянальны аспект і камунікатыўную значнасць моўных адзінак, якія ў маўленні становяцца будаўнічым матэрыялам для выказвання. Варта адзначыць, што ў метадычны апарат вучэбных дапаможнікаў новага пакалення ўключаны заданні пераважна пошукава-даследчага характару, якія прадстаўляюцца ў выглядзе моўных задач [3]. Выконваючы іх вучні асэнсоўваюць сутнасць моўнай з'явы праз лексіка-граматычны цэнтр тэмы, выяўляюць агульныя рысы, характэрныя для моўных адзінак, іх адрозныя формы, якія патрабуе той ці іншы маўленчы кантэкст.

Напрыклад, усведамленне спецыфічных прымет гукавой сістэмы беларускай мовы адбываецца пры вывучэнні тэмы "Гукі беларускай мовы". Настаўнік прапануе моўную задачу, удакладняе сістэмай пытанняў, якія вызначаюць кірунак назіранняў вучняў. Каб засвоіць асаблівасці ўтварэння і вымаўлення асобных гукаў, вучням прапануецца прачытаць тэкст, знайсці словазлучэнні, якія характарызуюць беларускую мову Моўныя факты і прыметы фанетычных адзінак з'яўляюцца асновай для іх далейшых вывадаў:

*Наша мова вечная, бо ўся яна, як наш характар. Здаецца, кволая ад пяшчотнай мяккасці, яна раптам кідае наверх схаваную ад усіх жалезную мужнасць і сілу. І, як быццам дамогшыся свайго, б'е, як перапёлка ў жытах — мякка, а за тры вярсты чуваць. Салодкае "эль", "дзе" — як шкляной палачкай па крышталі, мяккае "с", як соннае ціўканне сінічкі ў гняздзе. І побач "р", як гарошына ў свістку, і доўга, спявуча, адкрыта гучаць галосныя. А "г" прыдыхае так ласкава, як маці на лобік дзіцяці, каб перастаў сніць дрэнны сон (Паводле У. Караткевіча).*

Вучні рашаюць моўную задачу – шукаюць патрэбныя словазлучэнні, якія характарызуюць беларускую мову і выяўляюць яе спецыфічныя асаблівасці. Вызначаныя словазлучэнні і ўтвараюць лексіка-граматычны цэнтр тэмы. Вучні выпісваюць іх, характарызуюць гукі на аснове параўнанняў, прыведзеных у тэксце: *салодкае "эль"* ([л] — санорны); *"дзе" — як шкляной палачкай па крышталі* ([дз'] — звонкі гук, не дапускае асобнага палітарнага вымаўлення); *мяккае "с", як соннае ціўканне сінічкі ў гняздзе* ([с'], з'ява суседняй мяккасці свісцячых зычных); *"р", як гарошына ў свістку* ([р] — зацвярдзелы); *"г" прыдыхае ласкава* ([г] – фрыкатыўны, прыдыхальны); доўга, спявуча, адкрыта гучаць галосныя (для беларускай мовы характэрныя поўнагалосныя склады, выразнае вымаўленне галосных гукаў).

Такім чынам, засваенне лінгвістычнай тэмы адбываецца ў працэсе тэкставай дзейнасці праз аналіз матэрыялу, вылучэнне апорных моўных фактаў, параўнанне і абагульненне інфармацыі, запамінанне характарыстык моўных з'яў.

Змест маўленчых тэм складаюць маўленчыя паняцці, звесткі пра асноўныя прыметы тэксту, правілы яго кампазіцыйнай арганізацыі, прыёмы выражэння вядомай і новай інфармацыі. У вучэбную праграму ўключаны наступныя маўленчыя паняцці: прыметы тэксту (тэма, асноўная думка, цэласнасць, разгорнутасць, паслядоўнасць, кампазіцыйная завершанасць); функцыянальна-сэнсавыя тыпы маўленння (апавяданне, апісанне, разважанне); функцыянальныя стылі маўлення (гутарковы, мастацкі, навуковы, афіцыйны і публіцыстычны); жанры маўлення.

Відавочна, што цэнтральным маўленчым паняццем з'яўляецца тэкст як камунікатыўнае, семантычнае і структурнае адзінства. Таму ў працэсе вывучэння спецыяльных маўленчых тэм неабходна падвесці вучняў да ўсведамлення, што тэкст — гэта цэласнае, складанае ўтварэнне, якое валодае звязнасцю і мае пэўную структуру.

Прапануем заданні, накіраваныя разгляд паняцця тэкст і яго асноўных характарыстык:

1) *тэма тэксту:* пра што гаворыцца ў тэксце; з якой мэтай вядзецца паведамленне; у якой сітуацыі

адбываецца маўленне; як суадносіцца змест выказвання з сітуацыяй маўлення;

3) *асноўная думку тэксту:* што сцвярджае аўтар у тэксце; чым карысная інфармацыя для чытача; ці супадае аша думка з пазіцыяй аўтара;

4) *загаловак тэксту:* з чым суадносіцца загаловак тэксту — з тэмай ці асноўнай думкай; растлумачце сэнс загалоўка; падбярыце загаловак пры яго адсутнасці;

5) *кампазіцыя тэксту:* вызначце пачатак і заканчэнне тэксту; як суадносіцца пачатак і канец тэксту; вызначце асноўную частку; вызначце асобныя часткі тэксту і падтэмы;

6) *цэласнасць, разгорнутасць і паслядоўнасць:* вызначце сэнсавыя адносіны паміж часткамі; што было вядома чытачу і што новага паведамляе аўтар; знайдзіце апорныя словы і сказы ў тэксце, дзякуючы якім разгортваецца задума аўтара; пастаўце пытанні ад папярэдняга сказа да наступнага; вызначце, незалежныя ці залежныя сказы адзін ад аднаго, паслядоўны ці паралельны парадак сказаў у тэксце; знайдзіце сродкі сувязі сказаў у тэксце — лексічны паўтор, аднакарэнныя словы, займеннікі, прыслоўі, семантычна блізкія словы, сінонімы, злучнікі; разгрупуйце сродкі сувязі сказаў у тэксце на сінтаксічныя і лексічныя.

7) *завершанасць:* вызначце, ці дасягнута задума аўтара; вызначце, у якім сказе падаецца заключная думка;

8) *апавяданне як функцыянальна-сэнсавы тып маўлення:* ахарактарызуйце сітуацыю маўлення і вызначце тэму апавядання; знайдзіце  часткі апавядання — пачатак, развіццё падзей, заканчэнне апавядання; вызначце спосабы выражэння вядомай і новай інфармацыі; назавіце апорныя спалучэнні, якія перадаюць паслядоўнасць падзей; вызначце сродкі выражэння адносін аўтара да выказвання; падбярыце фактычны матэрыял для ўласнага апавядання па прапанаванай тэматыцы;

9) *апісанне як функцыянальна-сэнсавы тып маўлення:* ахарактарызуйце сітуацыю маўлення і вызначце прадмет апісання;  назавіце найбольш істотныя прыметы апісання прадмета; ахарактарызуйце прадмет ці з'яву па адной ці некалькіх прыметах; стварыце вобразнае апісанне праз характарыстыку прадметаў; стварыце навуковае апісанне з указаннем дакладных прымет прадмета апісання; вылучыце галоўныя прыметы ў лагічнай паслядоўнасці; падбярыце фактычны матэрыял для ўласных тэкстаў-апісанняў па прапанаванай тэматыцы;

10) *разважанне як функцыянальна-сэнсавы тып маўлення:* ахарактарызуйце сітуацыю маўлення і вызначце тэму разважання; вызначце кампазіцыйныя асаблівасці разважання (тэзіс, галоўная думка, аргументы і прыклады, вывад); вызначце прычынна-выніковыя сувязі з'яў і падзей у разважанні; знайдзіце доказы ў разважанні; падабярыце фактычны матэрыял у адпаведнасці з тэзісам разважання.

Сістэма працы з тэкставымі практыкаваннямі ў вучэбным дапаможніку пачынаецца з традыцыйных заданняў на вызначэнне стылю, тыпу маўлення, тэмы тэксту. Аднак яны з'яўляюцца толькі базавымі, прапанаваныя вышэй заданні даюць магчымасць настаўніку ўдакладняць і пашыраць метадычны апарат пэўнага практыкавання прыведзенымі заданнямі.

Маўленчы матэрыял у працэсе навучання беларускай мове засвойваецца непасрэдна і імпліцытна праз усведамленне спосабаў маўленчай дзейнасці, што спрыяе пераносу ўменняў і навыкаў маўленчай дзейнасці на працэс стварэння выказвання. З улікам таго, што тэкст — гэта прадукт маўлення, яго катэгорыі немагчыма разглядаць адасоблена ад дзейнасці суразмоўцаў. З гэтага вынікае, што характарыстыкі маўленчых паняццяў суадносяцца з характарыстыкамі сітуацыі маўлення, якія дапамагаюць асэнсаваць умовы стварэння тэксту, для чаго прапануюцца наступныя заданні:

1) назваць складнікі маўленчай сітуацыі;

2) апісаць папярэднія падзеі;

3) вызначыць задачу моўных зносін (паведамленне, уздзеянне, гутарка);

4) знайсці моўныя сродкі, адпаведныя есцу і мэтам маўлення;

5) вызначыць задачу выказвання;

6) назваць сітуацыйныя асаблівасці ўмоў афіцыйнага і неафіцыйнага маўлення.

Такім чынам, праца з тэкстам з'яўляецца адным з асноўных метадаў навучання маўленню, дзякуючы чаму адбываецца ўсведамленне законаў стварэння выказвання, пабудова ўласных маўленчых твораў як выніку матываванай і мэтанакіраванай вучэбнай дзейнасці.

Спасціжэнне заканамернасцей пабудовы ўласных тэкстаў, разгляд стылістычных, марфалагічных рэсурсаў адбываецца ў працэсе працы з тэкстам як узорам маўлення. Прапануем некаторыя заданні такога характару:

1) паназірайце за лексічным напаўненнем тэксту;

2) знайдзіце незразумелыя словы і вызначце іх значэнне, карыстаючыся тлумачалным слоўнікам;

3) знайдзіце ў тэксце сінонімы, антонімы;

4) знайдзіце мнагазначныя словы і словы, ужытыя ў пераносным значэнні, растлумачце іх ролю ў тэксце;

5) звярніце ўвагу на стылявую прыналежнасць лексікі, якія словы пацвярджаюць адпаведнасць тэксу вызначанаму стылю;

6) знайдзіце (калі ёсць) неалагізмы, архаізмы, гістарызмы, вызначце, для чаго яны ўжытыя аўтарам;

7) знайдзіце (калі ёсць) фразеалагізмы, вызначыце іх значэнне і з якой мэтай яны ўжываюцца ў тэксце;

8) знайдзіце сродкі мастацкай выразнасці, калі яны ўжываюцца ў тэксце (эпітэты, метафары, параўнанні, увасабленне і інш.), вызначыце, для чаго аўтар выкарыстоўвае іх у тэксце;

9) паназірайце за фанетычнымі сродкамі (паўтарэнне пэўных зычных гукаў — алітэрацыя, або галосных — асананс);

10) паназірайце за ўжываннем часцін мовы, ужытых у тэксце (дзеясловы для перадачы дзеянняў або апісання дынамікі дзеяння; прыметнікі для апісання прадмета або пейзажу; ужыванне выклічнікаў і час-

ціц для перадачы нечаканасці, здзіўлення, захаплення і інш.);

11) паназірайце за сінтаксісам тэксту (ужыванне сказаў пэўнай структуры: перавага простых або складаных, складаназлучаных і складаназалежных, ужыванне інверсіі, клічных, пытальных сказаў, простай мовы, дыялогу і інш.).

Такім чынам, у працэсе тэкставай дзейнасці вызначанага кірунку вучні ўчытваюцца ў тэкст, вучацца яго разумець, спасцігаюць функцыянальную ролю моўных адзінак.

Напрыклад, пры замацаванні тэмы "Галоўнае і залежнае словы ў словазлучэнні" вучням прапануецца заданне: *"Выпішыце з тэксту назоўнікавыя і дзеяслоўныя словазлучэнні. Паразважайце, якія тыпы словазлучэнняў пераважаюць. Чаму? Выкарыстоўваючы выпісаныя словазлучэнні, вусна перакажыце тэкст.*

*Віцебск – родны горад мастака Марка Шагала. Нават калі Шагал жыў у Парыжы, ён сумаваў па віцебскіх вуліцах. Кажуць, сцены аднаго з пакояў свайго шыкоўнага парыжскага дома мастак размаляваў вуліцамі Віцебска. На іх Шагал намаляваў дашчаныя тратуары, скасабочаны штыкетнік, звычайныя хаты і дамы. Мастак прыходзіў сюды штовечар, гуляў па намаляваных віцебскіх вуліцах. У цудоўным Парыжы яму так не хапала роднага Віцебска! (Паводле Я. Сіпакова).*

Такім чынам, для развіцця маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі важным з'яўляецца разгляд тэксту, па-першае, як адзінкі вышэйшага ўзроўню моўнай сістэмы, якая інтэгруе ўсе адзінкі мовы і вызначае іх функцыянаванне ў маўленні; па-другое, як адзінкі маўлення, якая з'яўляецца прадуктам маўленча-мысліцельнай дзейнасці і выступае пасрэднікам паміж камунікантамі ў працэсе суразмоўніцтва.

Фарміраванню лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі спрыяюць тэксты культуразнаўчага характару пра пэўныя гісторыка-культурныя падзеі, персаналіі, гістарычныя, прыродныя і геаграфічныя факты, іх адметнасці, месца і значэнне ў развіцці краіны. Этнаграфічныя і бытавыя краіназнаўчыя рэаліі прэзентуюцца праз уключэнне ў тэксты лексічных адзінак. якія называюць прадметы побыту, ежы, напояў. Інфармацыя пра найбольш вядомыя факты ў сучасным грамадскім жыцці рэпрэзентуецца ў анамастычных адзінках: тапонімах, антрапонімах, назвах прыродных аб'ектаў, гандлёвых марак прадукцыі, рэкламных назвах.

Напрыклад, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку тэксты пра вядомыя брэнды "Спартак", "Камунарка" выклікаюць самыя прыемныя асацыяцыі ў кожнага беларуса, бо згаданыя таварныя знакі кандытарскіх фабрык вядомыя ўсім з дзяцінства [2, с. 31]. Таму тым больш цікавай для вучняў будзе інфармацыя з тэксту пра месца знаходжання фабрыкі, яе значэнне для сучасных эканамічных працэсаў у жыцці краіны.

Заданні да тэксту пашыраюць веды, актуалізуюць матэрыял краіназнаўчага зместу, які будзе каштоўным і ў камунікатыўным плане, таму што "вучні авалодаюць маўленча-камунікатыўнымі ўменнямі ў тым выпадку, калі ім будзе прапанавана адпаведная спецыяльным чынам арганізаваная камунікатыўная дзейнасць — рознабаковая, цікавая, матываваная, кантралюемая, асобасна значымая" [5, с. 182].

Такім чынам, разгледжаныя аспекты тэкставай дзейнасці ў працэсе вывучэння сістэматычнага курса беларускай мовы з'яўляюцца асновай фарміравання кампетэнцый вучняў – моўнай, маўленча-камунікатыўнай, лінгвакультуралагічнай. У працэсе выканання заданняў тэкставага характару адбываецца засваенне лінгвістычных ведаў, развіццё ўменняў і навыкаў, якія забяспечваюць свабоднае маўленне ў розных сітуацыях. Уключэнне тэкствых практыкаванняў у сістэму працы адбываецца ў адпаведнасці з дыдактычнай мэтазгоднасцю, якая вызначаецца этапам, мэтай і задамі навучання беларускай мове. Гэта дае магчымасць вучням засвоіць правілы функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, усвядоміць іх значэнне для практычнага авалодання мовай. У адпаведнасці з вызначаным у вучэбнай праграме зместам навучання адбываецца праца, якая носіць не фрагментарны, а сістэмны характар, што дазваляе рэалізаваць дзейнасны падыход на працягу вывучэння ўсяго курса мовы і фарміраваць заяўленыя ў якасці адукацыйных мэтаў кампетэнцыі вучняў — моўную, маўленча-камунікатыўную, лінгвакультуралагічную.

## Спіс літаратуры


1. Адукацыйны стандарт базавай адукацыі [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: https://adu.by/images/2019/01/obrstandarty-ob-sred-obrazovaniya.pdf. — Дата доступу: 20.02.2023.
2. Беларуская мова : вучэб. дапам. для 5-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. Ч. 2 / Г. А. Валочка, В.У. Зелянко, С.В. Мартынкевіч і інш. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2019.
3. Мартынкевіч, С.В. Беларуская мова па новых падручніках. Парады аўтара / С.В. Мартынкевіч // Филология в современной школе: традиции и инновации. — 2020. — №2(6). — С. 50–53.
4. Мурына, Л.А. Сістэмна-функцыянальны і камунікатыўна-дзейнасны падыходы пры навучанні мовам у школе / Л.А. Мурына, Г.М. Валочка // Беларуская мова і літаратура. — 2006. — №10. — С. 28–32.
5. Яленскі, М.Г. Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання мове ў сучаснай школе / М.Г. Яленскі. — Мн.: НІА, 2002. — 212 с.


*Дата поступления в редакцию: 28.02.2023*